View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by BSU Digital Library

Козік, Л.А. Мечыслаў Францішак Ракоўскі – апошні прэм’ер-міністр Польскай Народнай Рэспублікі / Л.А. Козік // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 9. / редкол.: А.П. Сальков, О.А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Мн.: БГУ, 2014. – с. 143 – 148.

**Л. А. Козік**

# МЕЧЫСЛАЎ ФРАНЦІШАК РАКОЎСКІ — АПОШНІ ПРЭМ’ЕР-МІНІСТР ПОЛЬСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

Мечыслаў Францішак Ракоўскі быў апошнім прэм’ер-міністрам Польскай Народнай Рэспублікі і першым сакратаром Польскай аб’яднанай рабочай партыі. У артыкуле даецца біяграфічны нарыс дзеяча, у якім асноўная ўвага засяроджваецца на журналісцкай працы, у першую чаргу на пасадзе галоўнага рэдактара часопіса «Палітыка», і палітычнай кар’еры, характарызуецца яго «Палітычны дзённік», напісаны ў 1958—1990 гг. Дзейнасць Ракоўскага паказана на фоне палітычных падзей у краіне ў 1950—1980-я гг., што дазваляе выявіць цяжкасці і дасягненні ў працы журналіста і палітыка, акрэсліць яго стаўленне да апазіцыі і ўвядзення ваеннага становішча ў Польшчы, усведамленне неабходнасці правядзення рэформ у сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сферах.

Mieczysław Frantiszek Rakowski was the last prime-minister of the Polish People’s Republic and the last leader of the Polish United Workers’ Party. His biography is considered in the article. The author depicts his work as a journalist and the editor-in-chief of the magazine «Polityka», pays attention to his political career, characterizes «Political diaries», written in 1958—1990. Rakowski’s activity is shown in the larger historical context. It helps to reveal the difficulties and the achievements in his work as a journalist and a politician, his attitude to the opposition and role in the decision-making about the declaring martial law in Poland. The author describes how Rakowski comes up to necessity of the social, economical and political reforms.

*Ключавыя словы*: М. Ф. Ракоўскі, часопіс «Палітыка», Польская Народная Рэспубліка, апошні прэм’ер-міністр, Польская аб’яднаная рабочая партыя

*Keywords*: M. F. Rakowski, magazine «Polityka», Polish People’s Republic, the last prime-minister, Polish United Workers’ Party

У 2014 г. мінае 25 год з моманту правядзення ў Польшчы «Круглага стала» — перамоў прадстаўнікоў улады, апазіцыі і Касцёла, якія сталі пераломнай з’явай у развіцці краіны. Адным з палажэнняў падпісанага бакамі пагаднення было правядзенне парламенцкіх выбараў, удзел у якіх прымуць прадстаўнікі апазіцыі. Як вядома, па іх выніках новы дэмакратычны ўрад сфарміраваў прадстаўнік прафсаюза «Салідарнасць» Т. Мазавецкі. Дзейнасці яго кабінета, як і самому Мазавецкаму прысвечана шмат даследаванняў, на фоне якіх асоба яго папярэдніка — апошняга прэм’ер-міністра і першага сакратара Польскай аб’яднанай рабочай партыі (ПАРП) М. Ф. Ракоўскага незаслужана знаходзіцца ў цені. У гэтай працы мы паспрабуем пазнаёміць чытачоў з яго біяграфіяй.

**Шлях у палітыку.** Нарадзіўся М. Ракоўскі 1 снежня 1926 г. у вёсцы Кавалеўка Познаньскага ваяводства ў сям’і заможнага селяніна. Яго бацька валодаў 20 га зямлі, якія дасталіся яму ад выехаўшага ў Германію пасля абвяшчэння ў 1918 г. Польскай рэспублікі немца. Старэйшы Ракоўскі быў палітычна ангажаваным чалавекам. Некаторы час ён займаў пасаду солтыса, потым войта, быў прыхільнікам пілсудчыкаўскага Беспартыйнага блоку супрацоўніцтва з урадам, а потым Лагеру нацыянальнага адзінства [1, s. 8, 10].

У верасні 1939 г. бацька Ракоўскага быў арыштаваны, а потым расстраляны немцамі дзесьці пад г. Быдгашч. Яго сям’я была выселена, а таму 13-гадовы Мечыслаў быў вымушаны працаўладкавацца памочнікам токара на рамонтны завод чыгуначных саставаў у По-

**Козик Любовь Антоновна** — доцент кафедры истории южных и западных славян Белорусского государственного университета, кандидат исторических наук . E-mail: lubov.kozik@gmail.com

знані. Менавіта ў гады вайны ён захапіўся сацыялістычнымі ідэямі, што паўплывала на яго далейшы лёс. У 1945 г. Ракоўскі запісаўся дабраахвотнікам у Войска Польскае, адкуль быў накіраваны ў аддзел вайсковай інфармацыі, дзе ў 1946 г. уступіў у Польскую рабочую партыю. Да 1949 г. ён быў палітруком у арміі, а наступныя восем год працаваў з перапынкамі ў аддзеле прэсы і прапаганды Цэнтральнага камітэта (ЦК) ПАРП. Увесь гэты час яго характарызавалі як партыйна бескампраміснага афіцэра з правільным класавым падыходам. Маючы за плячамі толькі чатыры класы пачатковай школы, у 1952 г. Ракоўскі паступіў у Інстытут грамадскіх навук пры ЦК ПАРП, дзе ў 1957 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Нямецкая сацыял-дэмакратычная партыя ў пасляваенны перыяд» [1, s. 12; 2, s. 12].

Значны ўплыў на фарміраванне светапогляду маладога чалавека аказала яго першая жонка — сусветна вядомая скрыпачка В. Вілкамірская і яе творчае асяроддзе. Пад іх уздзеяннем адбыліся не толькі ўнутраныя, але і знешнія перамены пачынаючага партыйнага дзеяча: ён навучыўся ўсміхацца, стаў стыльна апранацца і змяніў прычоску [2, s. 12; 3, s. 325].

**Ракоўскі-журналіст.** У 1951 г. Ракоўскі ўступіў у Саюз польскіх журналістаў, дзе ў 1958—1961 гг. займаў пасаду старшыні Галоўнага праўлення. Менавіта журналісцкая дзейнасць стала найбольш знакавай у яго жыцці. У 1957 г. ён пачаў «доўгі раман» з часопісам «Палітыка», які разам з газетай «Трыбуна люду» быў афіцыйным органам ПАРП.

З'яўленне ў лютым 1957 г. штотыднёвіка «Палітыка» было ўспрынята ў польскім грамадстве як сведчанне адыходу першага сакратара ПАРП У. Гамулкі ад абвешчаных у 1956 г. рэформаў. Падставамі для такога меркавання былі папярэдні ціск і ганенні з боку партыйна-дзяржаўных органаў на крытычныя ў дачыненні да палітыкі ўлад выданні (у першую чаргу гэта датычылася штотыднёвіка «Папросту»), а таксама склад рэдкалегіі новага часопіса. У яе вайшлі вядомыя партыйныя дзеячы і прапагандысты: пісьменнік Е. Путрамент, кіраўнік аддзела прапаганды ЦК ПАРП А. Вэрблян, галоўны марксісцкі ідэолаг А. Шафф, супрацоўнік аддзела прапаганды М. Ракоўскі, які на працягу года быў намеснікам галоўнага рэдактара — міністра вышэйшай адукацыі С. Жулкеўскага. Пачатковую пазіцыю часопіса акрэсліў працяглы канфлікт з «Папросту», закрыццё якога восенню 1957 г. «Палітыка» патлумачыла не адыходам улады ад заваёў польскага Кастрычніка 1956 г., а адсутнасцю разумення палітычнай сітуацыі і працягам папярэдняй лініі супрацоўнікамі гэтага выдання [4, s. 8—13].

У 1958 г. галоўным рэдактарам «Палітыкі» быў прызначаны Ракоўскі. Свае абавязкі на гэтай пасадзе ён выконваў на працягу 25 год. Менавіта дзякуючы яму часопіс набыў папулярнасць і аўтарытэт у польскім грамадстве, а потым доўгі час лічыўся лепшым паміж Эльбай і Уладзівастокам. Працу на пасадзе галоўнага рэдактара «Палітыкі» Ракоўскі пачаў з падбору новай каманды, якая павінна была вывесці штотыднёвік на якасна новы ўзровень. Знакавай падзеяй у гэтым напрамку стала публікацыя ў маі 1961 г. прызнанняў нямецкага злачынцы А. Эйхмана, які быў выкрадзены ізраільскімі спецслужбамі ў Аргенціне і асуджаны ў Ізраіле. Яны былі запісаны ў выглядзе размовы з двума журналістамі ў 1956—1957 гг. у Буэнас-Айрэсе. Машынапіс гутаркі быў выкрадзены антыфашыстамі ў адваката Эйхмана ў Вене і невядома якім чынам трапіў у варшаўскае выдавецтва «Кніга і веды». Супрацоўнік «Палітыкі» Д. Пасэнт змог атрымаць гэты тэкст, а рэдакцыя вырашыла яго надрукаваць [4, s. 20]. 21 мая Ракоўскі занатаваў у дзённіку: «Мы не памыліліся. Першую частку прызнанняў Эйхмана лічаць сенсацыяй. У Варшаве «Палітыка» разышлася маланкава» [5, s. 289].

Варта адзначыць, што з 1958 па 1990 г. Ракоўскі вёў тайны палітычны дзённік, які выдаў у 1998—2005 гг. У ім ён занатоўваў свае размовы, перажыванні, думкі і разважанні, ацэнкі сітуацыі ў краіне і свеце ў цэлым. Яго «Дзённікі» сталі выключнай крыніцай па гісторыі ПНР. Параўнаўшы арыгінал запісаў з іх кніжным выданнем, польскі гісторык А. Пачкоўскі заўважыў у апошнім больш інфармацыі за кошт уключаных дакументаў і больш лагодныя характарыстыкі некаторых дзеячаў, але пры гэтым ён лічыць «Дзённік» унікальнай крыніцай, да якой, як і да іншых дакументаў, трэба падыходзіць крытычна і разважліва [6].



Ва ўмовах закуліснай барацьбы ў ПАРП, роста напружанасці ва ўзаемаадносінах улады і інтэлігенцыі, роста нацыяналізму Ракоўскаму даводзілася лавіраваць і прыкладаць значныя намаганні, каб утрымацца на плаву. Не аднойчы над галавой галоўнага рэдактара хадзілі хмары. Прычынай гэтага было ўсё большае разыходжанне ў поглядах Ракоўскага і Гамулкі па пытанні шляхоў далейшага развіцця ПНР. «Палітыка» ў другой палове 1960-х гг. станавілася ўсё больш тэхнакратычнай, у той час як улада — кансерватыўнай. Сведчаннем розніцы ў падыходах былі, напрыклад, «палітычна няправільныя» артыкулы з крытыкай смяротнага пакарання, жартам з якой-небудзь нязначнай падзеі, якая штучна раздзмухалася ўладамі розных узроўняў. Нават простае параўнанне «Палітыкі» з нямецкім часопісам «Шпігель» стварала галоўнаму рэдактару непрыемнасці [4, s. 30]. Сам Ракоўскі за час сваёй працы ў часопісе «заслужыў» негатыўныя як ва ўмовах сацыялістычнай Польшчы характарыстыкі — ліберал, рэвізіяніст, касмапаліт, менеджар.

У сярэдзіне 1960-х гг. у польскіх эшалонах улады з'яўляецца «група партызан», аб'яднаная вакол міністра ўнутраных спраў М. Мочара. Яна стаяла на выразна нацыяналістычных пазіцыях і спрычынілася да антысіяніцкай (а фактычна — антысеміцкай) кампаніі 1967—1968 гг. у Польшчы. «Партызаны» безвынікова імкнуліся здабыць сабе ў «саюзнікі» Ракоўскага і яго часопіс. «Палітыка» змагла супрацьстаяць рознага кшталту ціску і захаваць нейтральнае становішча, што ў значнай ступені было заслугай яе галоўнага рэдактара.

У 1970-я гг. — перыяд праўлення Э. Герэка — павялічваецца роля прапаганды ў грамадскім жыцці ПНР. Яе асноўнай задачай з'яўлялася адлюстраванне станоўчых перамен у жыцці краіны, якія адбываліся дзякуючы заходнім крэдытам. Але, як вядома, эйфарыя скончылася ўжо ў сярэдзіне 1970-х гг., калі «дасягненні» абярнуліся сур'ёзнымі сацыяльна-эканамічнымі праблемамі і рабочымі хваляваннямі. У гэтых умовах рэдакцыі «Палітыкі» даводзілася балансаваць на мяжы афіцыйна дазволенага ў адлюстраванні і крытыцы польскай рэчаіснасці.

Будучы галоўным рэдактарам уплывовага часопіса, Ракоўскі шмат разоў выязжаў за мяжу, дзе сустракаўся з вядомымі палітыкамі і грамадскімі дзеячамі. Вынікі такіх паездак, а галоўнае — назіранняў, знаходзілі адлюстраванне ў яго артыкулах і кнігах. Аднак галоўным вынікам яго сустрэч можна лічыць паляпшэнне і нармалізацыю польска-нямецкіх адносін.

**Шлях у вялікую палітыку.** З сярэдзіны 1960-х гг. М. Ракоўскі ўсё больш ангажуецца ў партыйную і палітычную дзейнасць. У 1964 г. ён стаў кандыдатам, а ў 1975 г. членам ЦК ПАРП, у сувязі з чым усё часцей у рэзанансных справах прымаў бок улады. Прыкладам гэтага з'яўляецца яго рэакцыя і пазіцыя ў сітуацыі вакол «Ліста 34-х», судовых працэсах М. Ваньковіча і Я. Н. Мілера. Падчас студэнцкіх хваляванняў 1968 г., выступаючы ў Варшаўскім універсітэце, Ракоўскі не пагадзіўся з прапановай на той час студэнта А. Міхніка выступіць у абарону праследуемых у СССР дысідэнтаў. Ён рашуча выказаўся за захаванне існуючага становішча, папярэдзіўшы прысутных, што «не трэба мядзведзя дражніць» [7].

У другой палове 1960-х гг. Ракоўскі аддаліўся ад палітыкі У. Гамулкі, чалавекам якога лічыўся, і зрабіў стаўку на Э. Герэка, які ў хуткім часе стаў новым лідарам краіны і прапанаваў рэформы. Такая змена пазіцыі галоўнага рэдактара адбілася і на часопісе, які ў пачатку 1970-х гг. зменшыў градус крытыкі палітыкі, якую праводзілі ўлады. У 1972 г. Ракоўскі ўпершыню быў абраны дэпутатам Сейма. Можа падавацца, што ён цалкам перайшоў на пазіцыю

ўлады. Аднак гэта не так. Ракоўскі, які публічна заўсёды выступаў у абарону сацыялізму і звяртаў увагу сваіх падначаленых на тое, што журналіст павінен быць адначасова палітыкам і менавіта з пункту гледжання палітычных прыярытэтаў і наступстваў думаць і пісаць, прызнаваў у прыватных размовах, што ў ПНР не хапае дэмакратыі [8, s. 100, 187]. У «Дзённіку» ж ён занатоўваў: «Ніколі не трэба забываць, у якой краіне жывеш» [4, s. 47].

У 1976 г. вера Ракоўскага ў рэформы Герэка скончылася. Прычынай гэтага стала павышэнне коштаў і рабочыя выступленні. Ён разумеў, што краіне неабходны грунтоўныя пераўтварэнні. Але як спалучыць свае адчуванні з палітыкай партыі і дзейнасцю галоўнага рэдактара аднаго з папулярных выданняў? Зразумела, што для Ракоўскага гэта быў няпросты выбар, тым больш пасля атрымання Дзяржаўнай узнагароды. Толькі ў 1979 г. ён напісаў артыкул «Людзі і гаспадарка», у якім фактычна выступіў за хуткае правядзенне рэформаў. Аднак іншы яго матэрыял пад назвай «Удасканальваць і змяняць», дзе прыводзіўся пералік недахопаў у гаспадаранні і выказвалася меркаванне аб правядзенні тэрміновых зменаў сістэмы кіравання, быў напачатку 1980 г. зняты цэнзурай [4, s. 61; 8, s. 202].

Канец 1970-х — пачатак 1980-х гг. быў складаным часам у гісторыі Польшчы. У краіне назіралася пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага становішча насельніцтва, частка якога адкрыта выказвала сваю незадаволенасць у выглядзе забастовак і дэманстрацый. Адміністрацыйны ціск на працоўных прывёў, з аднога боку, да зніжэння іх актыўнасці, а з другога — даў штуршок да ўзнікнення праваабарочных арганізацый (Камітэт абароны працоўных, Камітэт грамадскай самадапамогі і інш.). Іх з’яўленне сведчыла пра ўзнікненне, а потым замацаванне саюзу інтэлігенцыі і працоўных. Варта адзначыць, што Ракоўскі, як і большасць партыйна-дзяржаўных функцыянераў, сур’ёзна не ўспрымаў праваабарончыя арганізацыі. Напачатку 1990-х гг. ён узгадваў, што ў ПАРП свята верылі ў тое, што праўда на яе баку. Партыйнае кіраўніцтва было ўпэўнена, што падчас праўлення Герэка грамадства атрымала ад дзяржавы значна больш, чым разлічвала, а таму «некалькі дзесяткаў прафесійных апазіцыянераў» і іх дзейнасць не могуць стварыць пагрозу існуючаму ладу [9, s. 48, 49].

Аднак сітуацыя ў Польшчы ў гэты час складвалася не на карысць улады. Рабочыя выступленні летам 1980 г. вымусілі яе пайсці на падпісанне так званага «жнівеньскага пагаднення», адным з пунктаў якога была афіцыйная рэгістрацыя Незалежнага самакіруемага прафсаюза «Салідарнасць» на чале з Л. Валенсам. Становішча ў краіне знайшло адлюстраванне ў такіх артыкулах Ракоўскага, як «Людзі і палітыка», «Верагоднасць», «У коле супярэчнасцей, але і надзей» і інш. У іх ён папярэджваў пра магчымасць дэстабілізацыі сітуацыі ў ПНР, што ў сваю чаргу можа прывесці да напружанасці на міжнароднай арэне, зазначаў, што з самога факта забастовак партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва павінна зрабіць правільныя высновы як у пытаннях сацыяльна-эканамічнай палітыкі, так і метадаў ажыццяўлення ўлады ў краіне [10, s. 661, 666, 684]. Аднак гэта не азначала, што журналіст сімпатызаваў «Салідарнасці» і яе прыхільнікам.

Зорны час Ракоўскага на палітычным небасхіле пачынаецца ў лютым 1981 г., калі старшыня ўрада генерал В. Ярузэльскі прапанаваў яму пасаду свайго намесніка. Папярэднічала гэтаму публікацыя артыкула «Шанаваць партнёра» ў «Палітыцы». У ёй галоўны рэдактар заклікаў уладу да цярпення і большага разумення супрацьлеглага боку, бо менавіта па прычыне парушэння інтарэсаў працоўных і бюракратычна-тэхнакратычнай інтэрпрэтацыі сацыялістычнай дэмакратыі ўзніклі незалежныя прафсаюзы [4, s. 62, 63; 10, s. 696].

На новай пасадзе Ракоўскі адказваў за вядзенне перамоў з «Салідарнасцю». На сустрэчах з яе прадстаўнікамі ён паводзіў сябе высакамерна, часам нахабна, а ў якасці асноўнага аргумента выкарыстоўваў альбо пагрозы аб прымяненні сілы, альбо «савецкі фактар», калі заяўляў, што ў выпадку зрыву перамоў у Польшчу будуць уведзены савецкія войскі [11, s. 158; 10, s. 735]. Разам з тым, як адзначае польскі даследчык А. Фрышке, ужо вясной 1981 г. польскія ўлады сур’ёзна разглядалі магчымасць канфрантацыі з «Салідарнасцю». Адпавед-

нае рашэнне не было прынята толькі таму, што падчас сакавіцкіх перамоў абодва бакі перавысілі свае паўнамоцтвы і прыйшлі да пагаднення [12, s. 389]. Але ўлада адступаць не збіралася: 13 снежня 1981 г. у ПНР было ўведзена ваеннае становішча. Ракоўскі прымаў удзел у распрацоўцы гэтага рашэння і цалкам яго падтрымаў. У гэты час ён з'яўляўся адным з вострых крытыкаў «Салідарнасці», да партнёрскіх адносін з якой яшчэ нядаўна заклікаў.

Згаданыя факты, а таксама змена ў паводзінах Ракоўскага (высакамернасць, нахабства) адвярнулі ад яго частку творчага асяроддзя. У 1981 г. адбыўся раскол у рэдакцыі «Палітыкі», калі група журналістаў выступіла на баку праследуемай «Салідарнасці». Нават прадпрымаемыя Ракоўскім спробы вызваліць з месцаў інтэрніравання некаторых дзеячаў культуры не змянілі пераважна негатыўнага стаўлення да яго. Не паўплывала на пазіцыю творчых колаў і яго другая жонка — актрыса Э. Кемпіньская. Дадатковым ударам для палітыка і яго кар'еры стала рашэнне былой жонкі В. Вілкамірскай і двух ужо дарослых сыноў ад першага шлюбу застацца ў эміграцыі.

У 1985 г. пад уплывам сітуацыі ў ПАРП і краіне было прынята рашэнне аб стварэнні новага кабінета міністраў на чале са З. Меснерам. Ракоўскаму ў ім месца не знайшлося. Некаторыя лічаць, што прычынай гэтага, сярод іншага, была і пазіцыя Масквы, дзе палітыка не любілі. Негледзячы на такі паварот лёсу, Ракоўскі застаўся верным генералу В. Ярузэльскаму і яго палітыцы. Сваеасаблівай платай за гэта стала яго абранне ў 1987 г. членам Палітбюро ЦК ПАРП. Фактычна гэта азначала вяртанне ў вышэйшыя эшалоны ўлады.

Летам 1987 г. сітуацыя ў польскім грамадстве абвастрылася. Прычынай гэтага стала чарговае павышэнне коштаў. Супраць такога кроку ўрада на шэрагу прадпрыемстваў былі арганізаваны забастоўкі. Выйсце з крызісу Ярузэльскі бачыў у адстаўцы ўрада Меснера і стварэнні новага кабінета. Адным з кандыдатаў на пасаду прэм'ер-міністра быў Ракоўскі. Як адзначаў адзін з дарадцаў Ярузэльскага падпалкоўнік В. Гурніцкі, яго кандыдатура мела як станоўчыя, так і адмоўныя моманты. Да першых Гурніцкі залічаў добрае ўспрыняцце Ракоўскага на Захадзе, у сродках масавай інфармацыі, блізкіх да М. Гарбачова колах. Дадатным, на яго думку, было і тое, што прызначэнне палітыка прэм'ерам магло выклікаць замяшальніцтва сярод апазіцыі, якая мела з ім дачыненні яшчэ ў 1981 г. Што тычыцца асабістых якасцей, то тут Гурніцкі звярнуў увагу на здольнасць Ракоўскага да кампрамісаў і добрае здароўе. Сярод адмоўных рысаў палітыка былі названыя эгаізм, схільнасць да снабізму, адсутнасць грунтоўных ведаў па эканамічных праблемах [13].

Яшчэ ў 1987 г. Ракоўскі распрацаваў праграму рэформ, якую пасля правак падтрымаў В. Ярузэльскі. У сваёй запісцы (хаця цяжка назваць запіскай дакумент у 60 старонак) будучы прэм'ер-міністр звяртаў увагу на тэхналагічнае і інфармацыйнае адставанне краін сацыялістычнага блоку, неэфектыўнасць дзейнасці СЭУ; выступаў за наданне большай увагі праблемам адукацыі, навукі і культуры, адзначаў павелічэнне ролі Касцёла, які фактычна выступаў за знішчэнне камунізму ў польскім грамадстве; прапаноўваў праводзіць больш жорсткую палітыку ў дачыненні да апазіцыі. Дарэчы, гэта праявілася і падчас першага выступлення новага прэм'ер-міністра ў Сейме ў верасні 1988 г. Ён заявіў: «Наша пазіцыя зразумелая. Праўда — так! Партнёрства — так! Крытыка — так! Кампраміс — так! Але аслабленне канстытуцыйнага парадку, выкарыстанне [апазіцыяй фінансавых сродкаў] з чужых крыніц, дэмагогія, ціск — не!» [13]. Ракоўскі планаваў уключыць у склад свайго кабінета прадстаўнікоў так званай канструктыўнай апазіцыі. Такім чынам ён разлічваў заявіць пра існаванне ўрада шырокай кааліцыі, якая нясе адказнасць за правядзенне эканамічных рэформаў, і пазбегнуць неабходнасці весці перамовы з Валенсам. Аднак планы палітыка не спраўдзіліся: ніхто з мяркуемых саюзнікаў не пагадзіўся ўвайсці ў склад урада.

Першыя рашэнні аб правядзенні рэформ былі прынятыя кабінетам Ракоўскага, а фактычна кіраўніцтвам ПАРП, у снежні 1988 г. Яны былі накіраваныя на лібералізацыю эканомікі, увядзенне свабодных коштаў, пашырэнне канкурэнцыі, ліквідацыю прадуктовых

картак. Ракоўскі разумеў, што гэтыя крокі адмоўна будуць успрыняты насельніцтвам і прывядуць да падзення папулярнасці партыі, але з іншага боку ён добра ўсведамляў, што без эканамічных пераўтварэнняў палітычную сітуацыю ў краіне не выправіш. Пачатыя ім рэформы заклалі падмурак для будучай «шокавай тэрапіі» Л. Бальцэровіча. Разумеючы непазбежнасць кампрамісу з апазіцыяй, прэм'ер-міністр падтрымаў і ідэю правядзення афіцыйных перамоў з ёй.

Па выніках парламенцкіх выбараў 1989 г. Ракоўскі не прайшоў у склад Сейма, што стала фармальнай падставай для адстаўкі яго кабінета. Але гэта не азначала заканчэння палітычнай кар'еры. Пасля абрання Ярузэльскага прэзідэнтам Польшчы паўстала пытанне аб выбарах новага першага сакратара ПАРП. Такім чалавекам у ліпені 1989 г. стаў М. Ракоўскі. Аднак на гэтай пасадзе ён быў нядоўга — праз паўгады ПАРП была распушчана.

У 1990-я гг. — пачатку XXI ст. Ракоўскі не прымаў чыннага ўдзелу ў палітычным жыцці краіны. Пасля роспуску ПАРП ён уступіў у створаную на яе аснове Сацыял-дэмакратыю Рэспублікі Польшча, аднак у 1993 г., пасля закрыцця следства, якое вялося супраць яго [1], адыйшоў ад актыўнага палітычнага жыцця. Тым не менш для левых сіл да самай смерці ён быў свайго рода гуру, да меркавання якога заўсёды прыслухоўваліся.

Не забываў Ракоўскі і сваё журналісцкае мінулае. У 1990—2008 гг. ён выдаваў часопіс «Dziś. Przegląd społeczny», а ў 2003—2004 гг. вёў перадачу на адным з польскіх тэлеканалаў. Але асноўныя сілы аддаваў Ракоўскі барацьбе з цяжкай хваробай, ад якой памёр у 2008 г.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. *Rakowski M. F.* Jak to sie stało? Warszawa : Polska Oficyna Wydawnicza «BGW», 1991. 264 s.
2. *Wieczorkiewicz P., Błażejowska J.*Od Kani do Rakowskiego // Newsweek. Październik 2006. Nr 41. Dodatek «Zeszyt Historyczny». Nr 3. 15 s.
3. *Koper S.* Kobiety władzy PRL. Warszawa : Czerwone i Czarne, 2012. 367 s.
4. *Władyka W.* Polityka i jej ludzie. Warszawa : Polityka, 2007. 194 s.
5. *Rakowski M. F.* Dzienniki polityczne : w 10 t. Warszawa : Iskry, 1998—2005. T. 1 : 1958—1962. Warszawa, 1998. 518 s.
6. *Paczkowski A.* Pułapki «Dzienników» Rakowskiego [Электронны рэсурс]. URL: http://www.polityka.pl/historia/1540031,1,co-rakowski-dopisal-w-dziennikach.read (дата звароту 20.08.2013).
7. *Janicki M., Władyka W.* Pierszy i ostatni [Электронны рэсурс]. URL: http://polityka.pl/kraj/273296,1,pierszy-i-ostatni.read (дата звароту: 20.08.2013).
8. *Krajewski A.* Między współpracą a oporem. Twórcy kultury wobec systemu politycznego PRL (1975—1980). Warszawa : Wydawnictwo TRIO, 2004. 540 s.
9. *Rakowski M. F.* Zanim stanę przed trybunałem / Z Mieczysławem Rakowskim rozmawia D. Szymczycha. Warszawa : Polska Oficyna Wydawnicza «BGW», 1992. 155 s.
10. *Fik M.* Kultura polska po Jałcie. Kronika lat 1944—1981. London : Polonia, 1989. 835 s.
11. Krajowa Komisja Porozumiewawcza NSZZ «Solidarność». Posiedzenie 9—10 kwietnia 1981 r. / Do druku przyg. B. Kopka. Warszawa : Niezależna Oficyna Wydawnicza NOWA, 1996. 334 s.
12. *Friszke A.* Polska. Losy państwa i narodu. 1939—1989. Warszawa : ISKRY, 2003. 519 s.
13. *Kowal P.* Mietek, to nie czas. 25 lat temu Rakowski zostal premierem [Электронны рэсурс]. URL: http://www.polityka.pl/historia/xxwiekpol1945/1557473,1,25-lat-temu-rakowski-zostal-premierem.read (дата звароту: 20.08.2013).

Артыкул поступіў в рэдакцыю 15 верасня 2013 г.

[1] У 1990 г. супраць Ракоўскага распачалося следства па справе т. зв. «маскоўскай пазыкі». Гаворка ішла пра 1,2 млн долараў, якія кіраўніцтва КПСС передала ПАРП па просьбе апошняй. Палітыка абвінавацілі ў валютных махінацыях. Следства было спынена ў 1993 г., калі да ўлады ў Польшчы прыйшоў Саюз дэмакратычнай левіцы.